# Што такое адзінства?

Папруга Ульяна,
дзяржаўная ўстанова адукацыі “Петкавіцкая сярэдняя школа”,
7 клас

Адзін, адзінота, адзінства… Менавіта так, у такой паслядоўнасці з аднаго пачынаецца адзінства. Калі немаўля нараджаецца, яно разумее, што адно, і, адчуваючы сябе небяспечна ў адзіноце, крычыць, кліча маці і супакойваецца на яе руках, бо цяпер, разам з мамай, яны ўяўляюць сабой адно цэлае з дзвюх асоб – маленькае адзінства.

Немаўля расце і становіцца дарослым чалавекам, які хоча стварыць сям’ю. Але сям’я – таксама адзінства, і чалавеку патрэбна спачатку ўсвядоміць, што ён адзін, затым зразумець, хто ён ёсць і чаго хоча, навучыцца з адзінотай жыць, а пасля – ад радасці жыцця – сустрэць свайго чалавека і быць з ім у адзінстве: вернасці, адказнасці і каханні.

Адзінства ў сям’і грунтуецца на ўзаемапавазе і даверы. Кожны член сям’і павінен адчуваць, што яго меркаванне важнае, а пачуцці значныя. Калі мы ўмеем слухаць адзін аднаго, гэта стварае атмасферу камфорту і падтрымкі. У цяжкія часы менавіта сям’я павінна стаць той апорай, на якую можна разлічваць.

У сям’і адзінства выяўляецца ў любові і падтрымцы, што стварае спрыяльнае асяроддзе для ўсіх яе членаў. Калі бацькі і дзеці падтрымліваюць адзін аднаго, гэта спрыяе здароваму развіццю і ўмацаванню сямейных сувязяў, узаемаадносін. Сямейнае адзінства дазваляе пераадольваць цяжкасці і справіцца з праблемамі разам.

Адзінства ў грамадстве таксама пачынаецца з аднаго, з адзіноты. Менавіта так. Калі ты адзін на адзін сутыкаешся з няпраўдай, нянавісцю і іншымі не найлепшымі праявамі чалавечага сэрца, з’яўляецца важкасць твайго слова, уменне прабачыць, дапамагчы, з’яўляецца чалавечнасць, якая дае правільны напрамак і вучыць быць сапраўдным чалавекам.

Адзінства ў грамадстве – гэта супрацоўніцтва і салідарнасць. Яно дапамагае адчуваць сябе часткай супольнасці, што спрыяе мірнаму жыццю. У сучасным свеце, дзе разнастайнасць культур і традыцый з’яўляецца нормай, важна знайсці агульныя інтарэсы і мэты, якія аб’ядноўваюць людзей.

Нацыянальнае адзінства – гэта разуменне і павага да агульнай гісторыі, мовы, культуры. Яно ўзмацняе патрыятызм і грамадзянскую свядомасць, што спрыяе стабільнасці і развіццю краіны.

Вялікая Айчынная вайна стала адным з найважнейшых этапаў у гісторыі Беларусі. У гэты цяжкі час адзінства беларускага народа стала ключавым фактарам у барацьбе за свабоду і незалежнасць. Кожны грамадзянін незалежна ад полу і ўзросту ўкладаў сваю частку ў агульную перамогу. Праз цяжкасці і страты беларусы не раз прадэманстравалі любоў да Радзімы, гатоўнасць абараняць сваю зямлю і свае сем’і. Прыклады гераізму можна знайсці ў подзвігах патрыётаў, якія ў партызанскім руху змагаліся супраць фашысцкіх

захопнікаў. Адзінае імкненне да свабоды аб’ядноўвала людзей розных нацыянальнасцей у адзіную сілу ў барацьбе за вызваленне.

Людская памяць не можа забыць жахаў Вялікай Айчыннай вайны. Успамінаецца апавяданне Міхася Лынькова “Васількі”. Міхась Лынькоў напісаў яго пасля прачытання газетнага артыкула ад сёмага верасня 1941 года, у якім гаварылася, як фашысты бязлітасна закалолі штыкамі рахункавода калгаса Тышкевіча і яго сям’ю. З усёй сям’і застаўся жывы чатырнаццацігадовы сын Саша, які адпомсціў за сваю сям’ю, кінуўшы гранату ў машыну з нямецкімі афіцэрамі. Сям’я Міхася Лынькова (жонка яўрэйка Хана Абрамаўна і сын Марык) была расстраляна немцамі ў верасні 1941 года ў Старадарожскім раёне. Разам з імі была расстраляна і сям’я брата Рыгора – жонка з дачкой. Так з’явілася апавяданне “Васількі”, твор пра жыццё і смерць, мужнасць і гераізм, помсту і нянавісць да ворагаў. Балюча і страшна, што ў час вайны гінулі не толькі дарослыя, але і дзеці. Пісьменнік здолеў паказаць душэўны стан хлопчыка, калі ён убачыў забітую маці і яго маленькую сястрычку.

Калі на родную зямлю прыходзіць вайна, на яе абарону ўстаюць усе: малыя і старыя, хлопцы і дзяўчаты .... На мой погляд, у гэтым і заключаецца адзінства. І людзі, што прайшлі суровае пекла вайны, ніколі не забудуць гэтыя страшныя чатыры гады. А нашаму пакаленню дзяды пакінулі запавет: помніць – каб шанаваць, помніць – каб не забыць, помніць – каб не паўтарыць.

Адзінства – гэта не простае аб’яднанне людзей. Гэта – стварэнне агульных маральных каштоўнасцей, агульнага мыслення. Яно дазваляе нам будаваць будучыню, дзе пануе любоў, гармонія, дабрыня, прыгажосць і мір.

Беларуская мова захоўвае народную мудрасць пра адзінства ў прыказках. Нашы продкі гавораць нам: “Адзін у полі не воін”, “Адзін за ўсіх, а ўсе за аднаго”, “Мурашыная раць і льва пераможа”, “Народу адзінства, што птушцы крылы”, “Адзін за аднаго трымацца – нічога не баяцца”.

Такім чынам, адзінства пранізвае ўсе сферы нашага жыцця і напаўняе сэнсам кожны дзень праз узаемаадносіны з іншымі людзьмі, разам з якімі мы – нацыя.